Источник: “Наша слова” – 2014-05-28

# 90 гадоў з дня нараджэння Леаніда Побаля

Леанід Давыдавіч Побаль (н. 28.05.1924, в. Мікалаева Іўеўскага р-на - 28.05.2004), беларускі археолаг. Д-р гіст. навук (1978), прафесар (1990). Чл. Міжнар. уніі славянскай археалогіі, Польскага археал. т-ва, Бел. т-ва аховы помнікаў. Скончыў ін-т фізічнай культуры (1950), БДУ (1951). У 1950-55 працаваў ва ўстановах нар. асветы. З 1958 супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР; з 1970 заг. сектара, з 1980 заг. аддзела археалогіі, у 1986-91 - археалогіі першабытнага грамадства, з 1991 вядучы навук. супрацоўнік. Асноўны кірунак навуковай дзейнасці - вывучэнне гісторыі старажытных славян у Еўропе, у т. л. на Беларусі. У 1959-81 гг. вывучаў помнікі позняга этапу зарубінецкай культуры (2-я пал. 1- 5 ст. н. э.). Даследаваў абарончыя ўмацаванні гарадзішчаў 6-7 ст. да н. э.- 1-2 ст. н. э., паўзямлянкавыя і наземныя жытлы гарадзішчаў і селішчаў 3 ст. да н. э. Узначальваў археалагічныя экспедыцыі па вывучэнні ранняга жалезнага веку Беларусі. Вывучаў унікальны скарб упрыгожанняў 2-4 ст. са срэбра і бронзы, аздобленых каляровымі выемчатымі эмалямі, знойдзеных у 19 ст. на селішчы Красны Бор. Знайшоў і даследаваў больш за 100 фібул 3-1 ст. да н. э. (эпоха латэн) і бронзавых лунніц з каляровымі эмалямі, знойдзеных на селішчах Абідня і Тайманава. Даказаў мясцовае паходжанне на тэрыторыі Беларусі ў першых стагоддзях н. э. срэбных і бронзавых упрыгожанняў з выемчатымі эмалямі.

Творы: Славянские древности Белоруссии: (ранний этап зарубинецкой культуры). Мн., 1971; Славянские древности Белоруссии: (могильники раннего этапа зарубинецкой культуры). Мн., 1973; Славянские древности Белоруссии: (свод археологических памятников раннего этапа зарубинецкой культуры - с середи-ны III в. до н. э. по начало II в. н. э.). Мн., 1974; Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Мн., 1983; Новые данные о древнем Менеске (Минске) // Древности славян и Руси. - М., 1988; Индоевропейские черты в древностях археологических культур железного века Белоруссии: (К проблеме этногенеза славян) // VI Международный конгресс славянской археологии. - М., 1990.

Вікіпедыя.